**232.** Прачытайце табліцу. Звярніце ўвагу на аснову слоў, месца націску і зрабіце вывад, ад чаго залежаць склонавыя канчаткі назоўнікаў мужчынскага роду на ***-а (-я)***. Дапоўніце табліцу.

| Склон | Назоўнікі м. р. з націскам на аснове | | Назоўнікі м. р. з націскам на канчатку | |
|---|---|---|---|---|
| Н. | *ста́раста Жэ́ня* | *дзяду́ля Ва́сіль* | *суддзя́* | *старшыня́* |
| Р. | *старасты Жэні* | | *суддзі* | |
| Д. | *старасту Жэню* | | *суддзі* | |
| В. | *старасту Жэню* | | *суддзю* | |
| Т. | *старастам Жэнем* | | *суддзёй (-ёю)* | |
| М. | *(пры) старасце Жэню* | *(пры) дзяду́лю Васілю* | *(пры) суддзі* | |

**233.** Прачытайце, ставячы словы ў дужках у патрэбную форму.

1. Самая балючая рана ад свайго *(дзіця)*. 2. У ласкавага *(цяля)* дзве маці. 3. Заяц і жабы баіцца. 4. І сабака на таго не брэша, чый хлеб есць. 5. Страляў у сокала, а трапіў у варону. 6. Спех курам на смех.

Выпішыце з першых двух сказаў назвы маладых істот. Дапоўніце рад, утварыўшы ад назваў жывых істот, якія ўжываюцца ў астатніх сказах, назоўнікі, што абазначаюць маладых істот. Вусна праскланяйце адзін назоўнік у формах адзіночнага і множнага ліку.

## § 38. Нескланяльныя назоўнікі

**234.** Прачытайце тэкст.

Як будавалася мінскае **метро**? У далёкім 1977 годзе пачалася вельмі карпатлівая і адказная **праца**. Урачыстае адкрыццё першых васьмі **станцый** Маскоўскай лініі адбылося ў 1984 годзе.

Будаўніцтва Аўтазаводскай лініі стала сапраўдным **выпрабаваннем** для будаўнікоў. Пракладваць тунэлі перашкаджала **рака Свіслач**. Пры будаўніцтве станцыі «Няміга» знайшлі рэштткі старажытнага горада. Працу трэба было адкласці з-за раскопак. Нават раку прыходзілася паварочваць! Так з’явіліся першыя станцыі другой лініі.

Шмат узнагарод атрымала мінскае метро за **час** свайго **існавання**. Аднак самая высокая ўзнагарода — гэта шчырая падзяка жыхароў і гасцей горада за **зручнасць, хуткасць**, чысціню.

Імкліва будуецца **метрапалітэн** у XXI стагоддзі. Новы тэхналагічны ўзровень, высокая аўтаматызацыя, інтэлектуальныя сістэмы кіравання і кантролю, бяспека — усё для пасажыраў. Шмат планаў у мінскага метро на будучае *(Паводле сайта Belarus.by)*.

Перанясіце табліцу ў сшытак. Размяркуйце выдзеленыя словы па адпаведных слупках. Скланяльныя назоўнікі запішыце ў пачатковай форме.

| Назоўнікі | | | |
|---|---|---|---|
| **Скланяльныя** | | | **Нескланяльныя** |
| 1-е скланенне | 2-е скланенне | 3-е скланенне | |

Да нескланяльнага назоўніка падбярыце прыметнік.

! Назоўнікі, якія не змяняюцца па склонах, маюць толькі адну форму, называюцца **нескланяльнымі**. Да іх належаць:

- іншамоўныя агульныя і ўласныя назоўнікі, якія заканчваюцца на галосны гук: ***калібры, авеню, журы, Гётэ, Чылі***;
- прозвішчы на зычны, калі яны абазначаюць асоб жаночага полу: *Кацярыне* ***Русак***, *Ірыне* ***Кураш***;
- прозвішчы на ***-о*** (пад націскам) і на ***-ых***: *Івана* ***Крайко***, *Святланы* ***Сядых***;
- некаторыя складанаскарочаныя словы: *паступіла ў* ***БДУ*** *(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт)*, *студэнт* ***БДЭУ*** *(Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта)*.

**235.** Прачытайце словы. Дакажыце, што прыведзеныя назоўнікі з'яўляюцца нескланяльнымі.

Эскімо, пано, Радары, Тбілісі, рагу, кенгуру, Осла, паліто, **Дзюма**, івасі, Місісіпі, **піяніна**, Чуйко, аташэ, поні, бра, **інтэрв'ю**, Гюго, кіно.

Выпішыце ўласныя назоўнікі. Што яны абазначаюць?

Назавіце ў выдзеленых словах гукі і літары, якімі яны абазначаны. У якіх словах колькасць гукаў і літар не супадае? Чаму?



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

## *Гавары і пішы правільна*

Каб правільна ўжываць у маўленні нескланяльныя назоўнікі з прыметнікамі і дзеясловамі ў форме прошлага часу, трэба ўмець вызначаць іх род: *вытанчаная лэдзі*, *вясёлы канферансье*, *паскакаў кенгуру*.

**236.** Разгледзьце схему. Раскажыце, як пазбегнуць памылак у маўленні пры ўжыванні нескланяльных назоўнікаў. У якасці прыкладаў выкарыстайце словы з папярэдняга практыкавання: складзіце з імі словазлучэнні, далучыўшы да назоўнікаў прыметнікі, якія падыходзяць па сэнсе.

**Вызначэнне роду нескланяльных назоўнікаў**

**Мужчынскі род**
- назвы асоб мужчынскага полу;





- назвы жывёл і птушак;
- назвы гарадоў

**Жаночы род**
- назвы асоб жаночага полу;



- назвы рэк

**Ніякі род**
- неадушаўлёныя назоўнікі;
- назвы азёр



Род складанаскарочаных слоў вызначаецца па родзе асноўнага (апорнага) слова: *ВНУ — вышэйшая навучальная* ***ўстанова*** (ж. р.).

**237.** Вызначце назоўнікі паводле прыведзеных значэнняў. Падбярыце да назоўнікаў прыметнікі, каб па граматычнай форме прыметнікаў можна было вызначыць род нескланяльных назоўнікаў. Словазлучэнні запішыце, укажыце род назоўнікаў.

1. Падарожжа па кругавым маршруце. 2. Спартыўная барацьба, самаабарона без зброі. 3. Рознакаляровыя папяровыя кружочкі, якімі абсыпаюць адзін аднаго на карнавалах, маскарадах. 4. Гарадская падземная электрычная чыгунка. 5. Набор страў да абеду ў сталовай, рэстаране. 6. Назва замужняй жанчыны ў Францыі.

Для даведкі: *самба, турнэ, метро, канфеці, мадам, меню.*

**238.** Прачытайце тэкст. Спішыце першы абзац, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Вызначце род і склон нескланяльных назоўнікаў.

Японская паэзія вельмі прыгожая. Але яна зусім не падобная да знаёмых нам вершаў. Адзін з цікавых яе жанраў — незвычайн.. ха́йку. Хайку вельмі каротк.., складаецца з 17 складоў.

Знаёмай нам рыфмы ў хайку няма. Тут значна важнейшы рытм. У першым радку традыцыйна павінна быць пяць складоў, у другім — сем, а ў трэцім — зноў пяць. Яшчэ адна асаблівасць — кожны радок можа выконваць сваю ролю. Адзін апавядае пра тое, што адбываецца, другі — дзе адбываецца, а трэці — указвае калі. У хайку павінны прысутнічаць з'явы прыроды і поры года. Чытаць хайку — усё роўна, што глядзець на прыгожую карціну:

Між роснай травы
Дзьмухавей захістаўся.
Халодны ранак. *М. Шайбак.*
*(З часопіса «Свет падарожжаў»).*

Паспрабуйце стварыць сваю карціну праз верш у форме хайку. Якія вобразы можна ўявіць, паназіраўшы за тым, як падаюць сняжынкі? Да чаго падобна сонца, якое апускаецца за гарызонт? Якія думкі ўзнікаюць, калі глядзіш на застылыя ў шэрані дрэвы?

Выберыце адзін з прапанаваных варыянтаў ці свой варыянт як аснову для напісання хайку.

**239.** Напішыце сачыненне-апавяданне на тэму «Маленькае падарожжа». Падрыхтуйцеся да гэтай работы.

1. Падумайце над загалоўкам сачынення. Маленькім падарожжам можа быць звычайная прагулка, паездка з бацькамі, паход з сябрамі і інш. Галоўнае, каб у час падарожжа вы адкрылі для сябе штосьці новае, пазнаёміліся з новай краінай, сустрэліся з незвычайным чалавекам або паглядзелі на звыклыя з'явы іншымі вачыма.



2. Падумайце, пра што будзе сачыненне, сфармулюйце і запішыце асноўную думку.
3. Складзіце рабочы план. Насупраць пунктаў плана запішыце апорныя словы.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

4. Паводле тыпу маўлення сачыненне будзе апавяданнем. Успомніце будову тэксту-апавядання.

5. Па форме сачыненне будзе маналогам (апавяданне можа весціся ад 1-й асобы). Калі ў падарожжы будуць прымаць удзел іншыя персанажы, то ў тэкст сачынення ўключыце дыялог, простую мову.

6. Сачыненне павінна быць напісана ў мастацкім стылі. Таму разам з агульнаўжывальнай лексікай старайцеся выкарыстоўваць вобразныя сродкі мовы: параўнанні, словы ў пераносным значэнні, эпітэты.

7. Напішыце першы варыянт сачынення на чарнавіку. Перачытайце тэкст, праверце, ці ўдалося выканаць 1—5-ы пункты задання. Ці адпавядае колькасць абзацаў колькасці пунктаў плана?

8. Уважліва праверце пастаноўку знакаў прыпынку (звярніце ўвагу на афармленне дыялогу, калі ён уключаны ў тэкст). Праверце правапіс слоў.

С л о в ы і в ы р а з ы, якія можна выкарыстоўваць у якасці апорных:
*краіна, край, зямля;*
*падарожжа, паездка, вандроўка, вандраванне;*
*шлях, дарога, мяжа, мытня*;*
*чыгунка, чыгуначны вакзал, цягнік, самалёт;*
*чаканне, хваляванне, настрой, самаадчуванне;*
*сустрэча, знаёмства, уражанне, пачуццё;*
*паехаць, пайсці, накіравацца, адправіцца, рушыць;*
*спадабацца, здарожыцца, стаміцца;*
*Шчаслівай дарогі! Лёгкай дарогі! Усяго найлепшага! Да сустрэчы!*

## § 39. Спосабы ўтварэння назоўнікаў

**240.** Прачытайце прыказкі і прымаўкі. Растлумачце іх сэнс.

1. **Гультайства** горшае за хваробу. 2. Ранняя птушка **дзюбку** цярэбіць, а позняя — вочкі працірае. 3. На добрае **запытанне** добрае і апавяданне. 4. Не лянуйся за **плужком**, будзеш з **піражком**. 5. **Адклад** не ідзе на **лад**. 6. **Птушачка** па **зернетку** збірае і сытая бывае.

Вызначце, як утвораны выдзеленыя словы.